# ДА ЮБІЛЕЮ НАСТАЎНІКА

Дванаццатага ліпеня 2010 г. споўнілася 60 гадоў з дня нараджэння кандыдата педагагічных навук, дацэнта, заснавальніка і першага загадчыка кафедры дапаможных гістарычных дысцыплін і методыкі выкладання гісторыі БДПУ імя Максіма Танка Івана Іванавіча Багдановіча. На працягу ўсіх гэтых гадоў жыццёвы і навуковы шлях юбіляра самым непасрэдным чынам звязаны з айчыннай сістэмай школьнай гістарычнай адукацыі.

Працаваць І. І. Багдановіч пачаў у Старасельскай васьмігадовай школе, што на Ушаччыне. Пасля службы ў арміі настаўнічаў на Лепельшчыне, а ў 1972 г. паступіў на гістарычны факультэт Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя А. М. Горкага. Пасля заканчэння ВНУ Іван Іванавіч працаваў настаўнікам гісторыі і грамадазнаўства ў Забалоцкай сярэдняй школе Смалявіцкага раёна. Яшчэ ў студэнцкія гады ён зацікавіўся навукай і ў 1979 г. паступіў у аспірантуру МДПІ.

Вынікі плённай вучобы і праведзеных навуковых даследаванняў былі пакладзены ў аснову кандыдацкай дысертацыі «Организация познавательной деятельности учащихся при изучении в школьных курсах истории внешней политики КПСС и советского государства после Второй мировой войны (1945—1982 гг.)», паспяхова абароненай у 1982 г. у Маскве. Навуковым кіраўніком суіскальніка быў адзін з карыфеяў савецкай методыкі выкладання гісторыі П. В. Гара. Такім чынам І. І. Багдановіч стаў яго паслядоўнікам у галіне методыкі выкладання гісторыі ў БССР. З таго часу лёс вучонага непарыўна звязаны з гістарычным факультэтам БДПУ, на якім ён працуе і сёння.

З 1982 па 1991 г. Іван Іванавіч займаў пасады асістэнта, старшага выкладчыка, дацэнта, выконваючага абавязкі загадчыка кафедры гісторыі БССР і методыкі выкладання гісторыі і грамадазнаўства, намесніка дэкана гістарычнага факультэта. У 1989 г. яму было прысвоена навуковае званне дацэнта.

У 1992 г. у сувязі з неабходнасцю ўдасканалення навуковых даследаванняў і падрыхтоўкі студэнтаў у галіне спецыяльных гістарычных дысцыплін і методыкі выкладання гісторыі на гістарычным факультэце БДПУ была створана кафедра дапаможных гістарычных дысцыплін і методыкі выкладання гісторыі. Яе першым загадчыкам стаў Іван Іванавіч Багдановіч, які займаў гэтую пасаду да лістапада 2008 г.

За сваю шматгадовую працу Іван Іванавіч унёс значны ўклад у станаўленне і развіццё айчыннай метадычнай навукі. Ім апублікавана больш за 100 навуковых і навукова-метадычных публікацый, у тым ліку першы ў Беларусі вучэбны дапаможнік па методыцы выкладання гісторыі, рэкамендаваны Міністэрствам адукацыі для студэнтаў гістарычных факультэтаў ВНУ. Без перабольшвання можна сказаць, што некалькі пакаленняў настаўнікаў гісторыі навучаліся методыцы выкладання свайго прадмета менавіта ў І. І. Багдановіча.

Сферай навуковых інтарэсаў вучонага з'яўляюцца разнастайныя аспекты арганізацыі самастойнай вучэбна-пазнавальнай дзейнасці вучняў у працэсе навучання гісторыі. У прыватнасці, І. І. Багдановіч распрацаваў праблему станаўлення і развіцця нацыянальнай сістэмы гістарычнай адукацыі і методыкі выкладання гісторыі пачынаючы з другой паловы XIX ст.; выявіў метадычныя ўмовы павышэння эфектыўнасці сучаснага ўрока гісторыі; раскрыў шляхі рэалізацыі выхаваўчага патэнцыялу школьнага курса гісторыі Беларусі і фарміравання ў школьнікаў гістарычнай эмпатыі.

Пры непасрэдным удзеле вучонага ў 1999 г. пры кафедры дапаможных гістарычных дысцыплін і методыкі выкладання гісторыі пачала працаваць аспірантура па спецыяльнасці 13.00.02 — тэорыя і методыка навучання і выхавання (гісторыя). Пад кіраўніцтвам І. І. Багдановіча былі падрыхтаваны і абаронены першыя ў нашай краіне кандыдацкія дысертацыі па методыцы выкладання гісторыі (С. В. Паноў, В. У. Гінчук, А. А. Корзюк). Іван Іванавіч па праву можа лічыцца заснавальнікам айчыннай школы метадыстаў-гісторыкаў, у цэнтры даследавання якой знаходзяцца навукова-метадычныя асновы рэалізацыі дзейнаснага падыходу ў працэсе навучання гісторыі.

Вялікую ўвагу І. І. Багдановіч надае ўдзелу студэнтаў у навукова-даследчай працы, арганізацыі штогадовых студэнцкіх навукова-практычных канферэнцый «Вывучэнне гісторыі роднага краю як сродак патрыятычнага выхавання моладзі», абагульненню і распаўсюджанню перадавога педагагічнага вопыту і інавацыйных тэхналогій навучання. З пачатку выдання часопіса «Гісторыя: праблемы выкладання» ён — пастаянны член рэдакцыйнай калегіі. На працягу многіх гадоў І. І. Багдановіч з'яўляецца вучоным сакратаром спецыялізаванага савета па абароне дысертацый К 02.21.03 пры БДПУ.

Супрацоўнікі гістарычнага факультэта, выкладчыкі кафедры дапаможных гістарычных дысцыплін і методыкі выкладання гісторыі, вучні, калегі, сябры шчыра віншуюць Івана Іванавіча з юбілеем і жадаюць моцнага здароўя, дабрабыту, творчага плёну і поспехаў у здзяйсненні ўсіх яго планаў!

*Мікалай Забаўскі, доктар гістарычных навук, дэкан гістарычнага факультэта;*

*Аляксандр Корзюк, кандыдат педагагічных навук, загадчык кафедры дапаможных гістарычных дысцыплін і методыкі выкладання гісторыі;*

*Анатоль Люты, доктар гістарычных навук, прафесар, загадчык кафедры гісторыі Беларусі*

*(Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка)*